рычны часопіс», «Выхаванне і дадатковая адукацыя»), белые плашки с необычной обводкой («Минская школа сегодня», «Пачатковае навучанне»), с наложением различных эффектов. В некоторых журналах их вообще не используют («Спецыяльная адукацыя»).

Таким образом, все формообразующие элементы научно-методических журналов взаимосвязаны и введены таким образом, чтобы образовать удобную навигационную систему, создать условия для легкого восприятия информации, подчеркнуть научность и строгость издания, удержать равновесие между максимальной информативностью и эстетикой.

ЛИТЕРАТУРА

1. РУП «Издательство «Адукацыя і выхаванне» [Электронный ресурс]– Режим доступа: – https://aiv.by/ru/index.php?route=common/home. Дата доступа: 27.01.2021.

2. Галкин, С. И. Техника и технология СМИ: Художественное конструирование газеты и журнала: Учеб. пособие / С. И. Галкин. – М. : Аспект Пресс, 2007, – 215 с.: цв. вкл.

УДК 378.1

А. В. Канановіч, асп. (БДТУ, г. Мінск)

## ВЫДАВЕЦКІЯ СТРУКТУРЫ ТЭХНІЧНЫХ УСТАНОЎ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Аб’ектам даследавання сталі дзве выдавецкія структуры тэхнічных УВА Гомельшчыны – Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту (БелДУТ) і Выдавецка-паліграфічны аддзел Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В. Сухога (ГДТУ). Прадметам стала структура гэтых арганізацый.

Задача даклада – устанавіць і параўнаць структуры выдавецкіх арганізацый вядучых тэхнічных УВА Гомельшчыны. Матэрыялам для даследавання паслужылі адкрытыя крыніцы – сайты УВА.

У структуру выдавецкага цэнтра БелДУТ пад кіраўніцтвам начальніка Т.М. Маруняк ўваходзяць:

1) рэдакцыйны сектар, дзе паводле штатнага раскладу працуюць загадчык выдавецкага цэнтра, вядучы рэдактар, тры рэдактары, тэхнічны рэдактар, два карэктары;

2) паліграфічны участак складаецца з інжынера-механіка, аператара капіравальных машын, аператара электроннага набору і

вёрсткі, друкарніка плоскага друку, друкарніка высокага друку, машыніста рэзальных машын, пераплётчыкаў, укладальніка-упакоўшчыка, прыбіральніка;

3) у фінансавую групу ўваходзяць два бухгалтары, эканаміст, спецыяліст па маркетынгу, кладаўшчык;

4) аддзелу таксама належыць крама, у якой працуе прадавец.

Структура выдавецка-паліграфічнага аддзела ГДТУ імя П.В. Сухога іншая. Тут уладкаваны 10 супрацоўнікаў. Кіраўніком з’яўляецца загадчык аддзела М.У. Краўцова. Таксама ў штаце рэдактар, карэктар, тэхнічны рэдактар, два камплектоўшчыкі, два пераплётчыкі, два аператары лічбавага друку.

У структуру выдавецка-паліграфічнага аддзела ўваходзяць наступныя падраздзяленні: 1) участак рэдакцыйна-тэхнічнай падрыхтоўкі выданняў; 2) друкавана-множны ўчастак; 3) участак платных паслуг.

Такім чынам, выдавецкія структуры тэхнічных УВА Гомельшчыны істотна адрозніваюцца. Адпаведна можна зрабіць наступныя высновы.

1. У БелДУТ для выдавецкага цэнтра адведзена больш за 30 ставак, для выдавецка-паліграфічнага аддзела ГДТУ імя П.В. Сухога – 10.

2. Выдавецкія комплексы паслуг ва УВА шырокія – ад рэдагавання і выпуску навуковай, вучэбнай і навукова-папулярнай літаратуры да аказання платных паслуг пры пераплёце, чорна-белым і каляровым тыражаванні.

3. Выдавецкі цэнтр – больш шырокае паняцце, чым выдавецка-паліграфічны аддзел. Справядліва, што ў БелДУТ штат супрацоўнікаў значна большы, таму што асобнымі штатнымі адзінкамі праходзяць прадстаўнікі фінансавай групы і прадавец. Значыць, у БелДУД наладжана сістэма распаўсюджвання друкаванай прадукцыі з першага (распрацоўка ідэі і праца з аўтарамі) і да апошняга (продаж чытачам) этапа.